**Блажэвіч, Э**. Усюды паспявае / Э. Блажэвіч // Міёрскія навіны. — 2012. — 8 снеж. — С. 2.

# УСЮДЫ ПАСПЯВАЕ




*– Анатоль Мікалаевіч Валынец за працяглы перыяд работы ў сельгасвытворчасці асвоіў шмат сельскагаспадарчых прафесій. Працаваў на машыне. Затым перасеў за руль трактара. Пазней перакваліфікаваўся на электрагазазваршчыка і ўжо шмат гадоў паспяхова спраўляецца з новымі абавязкамі, – расказвае галоўны інжынер філіяла КЗ «Цітова» В. В. Кадушка і акцэнтуе ўвагу на тым, што гэты работнік заўсёды пры справе. Летам яго можна было ўбачыць і на полі ля тэхнікі, і ў майстэрні, і ля жывёлагадоўчага абсталявання на пашах, і на фермах, дзе вяліся рамонтныя работы. Цяпер у большасці задзейнічаны на жывёлагадоўчых аб’ектах. Выязджае па выкліку на любы аб’ект і робіць гэта хутка.*

У распараджэнні А. М. Валынца трактар, якім ён сам жа і кіруе, ды прычапны зварачны агрэгат, аснашчаны ўсім неабходным абсталяваннем. Зразумела, ёсць у электрагазазваршчыка і неабходная экіпіроўка. Сустэцца з гэтым вясковым работнікам давялося на малочнатаварнай ферме «Субачава», дзе сёлета праведзена шырокамаштабная рэканструкцыя вытворчых памяшканняў.

– Анатоль Мікалаевіч зрабіў немалы ўклад у пераабсталяванне вытворчых памяшканняў на гэтым аб’екце. І наперадзе ў яго тут яшчэ шмат турбот, бо будзем побач з кароўнікам узводзіць яшчэ адно жывёлагадоўчае памяшканне – «арачнік», металічныя канструкцыі якога ўжо завезены, – кажа дырэктар гаспадаркі Марыя Вікенцьеўна Сцяпанава і вядзе мяне на пляцоўку перад фермай, дзе, быццам навагоднія бенгальскія агні, іскрыла газазварка.

Анатоль Мікалаевіч прыпыніў работу, прыпадняў з твару ахоўную маску. Злезшы з лесвіцы на зямлю, няспешна замацаваў шлангі і балоны. Падышоў да нас толькі тады, калі акуратна склаў увесь рабочы інвентар, хаця і ведаў, што праз лічаныя хвіліны давядзецца зноў узяцца за справу. Але такую акуратнасць ён не лічыць лішняй, бо яна патрэбна і для бяспекі, і для захавання ў добрым стане рабочага абсталявання. Расказваючы пра сваю прафесію, зазначыў, што яна не такая простая, як здаецца, многаму трэба навучыцца. А вось калі ўжо ёсць пэўныя веды і навыкі, то справа спорыцца.

– Патрэбны і невялічкія перапынкі, бо пры працяглай рабоце ад яркага полымя, нягледзячы на ахоўную маску, усё ж стамляюцца вочы, – падкрэсліў А. М. Валынец. Рэлаксацыйны перапынак не заняў і пяці хвілін. Зноў успыхнула зварка, заварожваючы сваім прыгожым агеньчыкам.

**Э. Блажэвіч**